# ВОСПИТАНИЕ В СОТВОРЧЕСТВЕ
## (активные методы в воспитательной работе с учащейся молодежью)

Сборник научных статей

Выпуск 3

Минск
РИВШ
2011

УДК 378(08)
ББК 74.58
В77

Рекомендовано
кафедрой молодежной политики
ГУО «Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 7 от 23 декабря 2009 г.)

Рецензенты:
зав. кафедрой педагогики РИПО, доктор педагогических наук, профессор *В. Н. Наумчик;*
зав. кафедрой психологии и педагогического мастерства, кандидат психологических наук, доцент *А. Н. Сизанов*

В77 **Воспитание** в сотворчестве (активные методы в воспитательной работе с учащейся молодежью) : сб. науч. ст. Вып. 3 / под науч. ред. д-ра филос. наук, проф. В. В. Познякова. – Минск : РИВШ, 2011. – 204 с.
ISBN 978-985-500-432-6.

В сборнике раскрывается содержание форм и методов воспитательной работы среди учащихся. Особое место занимает специфика воспитательной деятельности куратора студенческой группы. Обосновывается необходимость овладения педагогом, наряду со специальными, метакомпетенциями профессиональной деятельности. Показывается, что в их основании лежат методы системного анализа и синтеза, моделирования, проектирования, прогнозирования, раскрываемые авторами на материале конкретного опыта моделирования и проектирования воспитательных ситуаций, адаптации студентов к новым условиям жизнедеятельности в образовательном учреждении, форм и методов работы куратора.

Материалы могут быть полезны кураторам и воспитателям студенческих общежитий, специалистам по работе с молодежью, лидерам молодежных организаций, классным руководителям школ, методистам, курирующим воспитательный процесс, и другим категориям педагогических работников.

**УДК 378(08)**
**ББК74.58**

**ISBN 978-985-500-432-6**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2011

# СОДЕРЖАНИЕ

*Кожуховская Л. С., Позняков В. В.* Приглашение к сотворчеству .......... 5
*Дементьева Т. В.* О роли куратора студенческой группы в воспитательном процессе .......... 13
*Борисова И. А.* Роль куратора группы в адаптации студентов к новым условиям образовательного процесса .......... 18
*Макоско В. В.* Кураторский час как ведущая форма организации внеаудиторной работы куратора со студентами .......... 25
*Позняков В. В.* Воспитательная ситуация как объект моделирования .... 39
*Толкачева Н. В.* Экспериментальное моделирование инновационного отношения студентов к учебной деятельности .......... 55
*Аксючиц С. А.* Сотрудничество субъектов учебной деятельности в процессе решения проектных задач .......... 63
*Кахноўская А. У.* Формы і метады далучэння дзяцей да этнічнай культуры .......... 71
*Калачева И. И.* Актуальные проблемы семьи и брака в современных условиях .......... 85
*Макоско В. В.* Повышение квалификации преподавателей-кураторов вузов глазами преподавателя ИПК .......... 91
*Позняков В. В.* Проектирование как метакомпетенция специалиста ...... 98
*Саликов А. Э.* Методика разработки молодежных инновационных проектов: культурологический подход .......... 109
ЗАКЛЮЧЕНИЕ .......... 120
СВЕДЕНИЯ ОБ АВТОРАХ .......... 124
ПРИЛОЖЕНИЯ .......... 125
*Муравьева М. И.* Проектирование воспитательной работы (реферат на примере разработки проекта «Клуб будущей хозяйки» в Белорусской государственной сельскохозяйственной академии) ...... 125
*Гурикова Е. И.* Проектирование воспитательной работы в вузе (на примере организации волонтерского движения «За здоровый образ жизни» в Белорусской государственной сельскохозяйственной академии) .......... 132
*Мангутова В. В.* Волонтерский клуб: разработка и реализация проекта .......... 141

знания и продвигая первоклассников, пятиклассники самостоятельно пополнили свои знания, умения и навыки. Практическая работа с первоклассниками позволила на более глубоком уровне изучить содержание материала по разделу «Фонетика». По итогам анкетирования участников семинара было отмечено, что в целях совершенствования профессионального мастерства, педагогам целесообразно использовать в своей практике уроки решения проектных задач для объективного и более глубокого контроля и оценки содержательных знаний и коммуникативных навыков.

Таким образом, проектные задачи играют большую роль в становлении учебного сотрудничества и формировании гибкой личности, способной к развитию, сотрудничеству и самостоятельному принятию решений в нестандартной жизненной ситуации. Они способствуют воспитанию чувства ответственности, формированию личности, способной к развитию, сотворчеству и принятию нестандартных решений.

**Список литературы**


1. *Адамский, А. И.* Детская экспертиза образовательной деятельности – как образовательная программа / А. И. Адамский // Ученик – субъект образовательного процесса. – М., 2005. – 208 с.

2. *Болотов, В. А.* Размышления о педагогическом образовании / В. А. Болотов, В. В. Сериков // Педагогика. – 2007. – № 9. – С. 3–11.

3. *Воронцов, А. Б.* Педагогическая технология контроля и оценки учебной деятельности (система Д. Б. Эльконина – В. В. Давыдова) / А. Б. Воронцов. – М., 2002. – 101 с.

4. *Воронцов, А. Б.* Учебная деятельность: введение в систему Д. Б. Эльконина – В.В. Давыдова / А. Б. Воронцов, Е. В. Чудинова. – М., 2004. – 165 с.

5. Педагогика: большая современная энциклопедия / сост. Е. С. Рапацевич. – Минск, 2005. – С. 127–128.

6. *Поливанова, К. Н.* Проектная деятельность школьников: пособие для учителя / К. Н. Поливанова. – М., 2008. – 192 с.

7. Программа «Комплексная информатизация системы образования Республики Беларусь на 2007–2010 годы» // Информатизация образования. – 2007. – № 7. – С. 3–21.

8. Проектные задачи в начальной школе: пособие для учителя / А. Б. Воронцов [и др.]; под ред. А.Б. Воронцова. – М., 2009. – 176 с.

9. Психолого-педагогические проблемы развития школьника как субъекта учения / под ред. Е. Д. Божовича. – М., 2000 г.

10. *Сухомлинский, В. В.* Сердце отдаю детям В. В. Сухомлинский // Избранные педагогические сочинения: в 3 т. – М., 1979–1980. – Т. 1. – С. 163–167.

11. *Шакура, С. Д.* Умение учить себя как средство саморазвития личности учащихся / С. Д. Шакура, С. А. Аксючиц, Г. В. Пехота // Психолого-педагогические проблемы становления личности в процесс учебной деятельности: материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17–18 дек. 2009 г. / под ред. А. А. Глинского; АПО. – Минск, 2009. – С. 479–493.

12. *Эсаулов, А. Ф.* Психология решения задач: метод. пособие / А. Ф. Эсаулов. – М., 1972. – 216 с.




*А. У. Кахноўская*

# ФОРМЫ І МЕТАДЫ ДАЛУЧЭННЯ ДЗЯЦЕЙ ДА ЭТНІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Поспех далучэння дзяцей да этнічнай культуры беларусаў у многім залежыць ад эфектыўных формаў і метадаў. Пад *формай* мы разумеем знешняе адлюстраванне працэсу выхавання, які звязаны з колькасцю выхаванцаў, часам і месцам выхавання, а таксама парадкам яго арганізацыі [8, с. 13].

Паколькі этнічную культуру мы разглядаем як сістэму, то лічым немагчымым атрымаць якасныя звесткі пра цэласную сістэму толькі па асобных яе кампанентах. У сувязі з гэтым канструктыўная метадалагічная роля пры вывучэнні этнічнай культуры павінна надавацца сістэмнаму падыходу. Таму адной з эфектыўных формаў далучэння дзяцей да этнакультуры, на нашу думку, могуць стаць *спецыяльна арганізаваныя заняткі (спецкурсы, факультутывы) комплексна-інтэграванага характару*.

Комплексны падыход накіраваны на забеспячэнне выкарыстання разнастайных формаў і сродкаў для выхавання каштоўнасных адносін да культуры свайго народа. Дадзены падыход дадатна ўплывае на свядомасць, пачуцці і паводзіны дзіцяці і забяспечвае адначаснае вырашэнне задач разумовага, фізічнага, маральнага, эстэтычнага і працоўнага выхавання ў адзіным педагагічным працэсе. Такія заняткі дазволяць атрымаць дзецям цэласную карціну свету, сфарміраваць сістэмныя веды і абагульненыя ўменні. Змест вышэйзгаданых заняткаў, як правіла, выклікае ў дзяцей ярка выражаную эмацыянальную рэакцыю і дазваляе ў практычнай дзейнасці актуалізаваць творчыя здольнасці і «пражываць» асаблівасці этнакультуры свайго народа.

Заняткі комплексна-інтэграванага характару дапамогуць педагогу выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі, розныя метады, формы і віды дзейнасці, захоўваючы пры гэтым адзінства тэматычнага зместу, што задаволіць патрэбу дзяцей у пазнанні этнакультурнага свету ва ўсёй яго разнастайнасці [11, с. 29]. Міжпрадметныя сувязі могуць прагледжвацца і ў аб'яднанні раздзелаў па азнаямленні з прыродай і грамадскім жыццём, грамадскім жыццём людзей і этнакультурнымі традыцыямі і мастацкай дзейнасцю і інш. Значнае месца мы адводзім

сумеснай і самастойнай дзейнасці ўсіх суб'ектаў этнапрасторы, выкарыстанню семіятычных і міфавобразных структур этнакультуры – беларускіх народных гульняў. Культуратворчая дзейнасць падчас заняткаў уключае мадэляванне, лепку, маляванне, дызайн і інш., што з'яўляецца, па нашым меркаванні, вынікам адлюстравання эмацыянальнага водгуку дзіцяці на раней атрыманую інфармацыю.

У нашым даследаванні ў якасці прыярытэтнага віду культураадпаведнай дзейнасці разглядаецца пазнавальная дзейнасць. Спецыфікай пазнавальнай дзейнасці з'яўляецца яе арыентаванасць на этнічную культуру беларусаў. Для павышэння этнічнай дасведчанасці, станаўлення каштоўнасных арыенціраў дзяцей неабходны веды, на аснове якіх складваюцца ўяўленні пра жыццё і быт народа, яго каштоўнасныя арыентацыі. У дзіцяці павінна з'явіцца жаданне авалодаць гэтымі ведамі – размова ідзе пра матывы. З'яўленне матываў вабіць за сабой адносіны да якасці, якая, у сваю чаргу, фарміруе сацыяльныя пачуцці, што ўплываюць на трываласць ведаў. Веды і пачуцці параджаюць патрэбу ў іх практычнай рэалізацыі – дзеяннях, учынках, паводзінах. Усю работу па далучэнні дзяцей да этнічнай культуры мэтазгодна арганізаваць, зыходзячы з лагічнай паслядоўнасці наступных этапаў [5, с.13]:

• пазнавальны – перадача ведаў аб этнічнай гісторыі і культуры, зыходзячы з дзейнаснага падыходу (узаемадзеянне суб'ектаў этнапрасторы, сумесная культуратворчая дзейнасць);

• каштоўнасна-арыентацыйны – фарміраванне каштоўнасных арыентацый на аснове набытых ведаў (цікавасці, эмацыянальнага водгуку, актыўнае ўключэнне ў даступныя дашкольнаму ўзросту этнакультурныя традыцыі і звычаі, ствараючую прадуктыўную дзейнасць);

• дзейнасны – арганізацыя даступнай пэўнаму ўзросту этнакультуратворчай дзейнасці (экскурсіі, заняткі, музыка, чытанне, святы, забавы і інш.).

У рабоце па этнакультурным выхаванні мэтазгодна арыентавацца на актыўнае выкарыстанне *пазнавальных гутарак на этналагічныя тэмы* як на самастойную форму работы. Змест такіх гутарак можа быць абумоўлены тэматыкай заняткаў або будавацца ў залежнасці ад разнастайных абставін [11, с. 29]:

• суб'ектыўнага вопыту жыццядзейнасці ў сям'і, пры зносінах з роднымі, так як кожная сям'я мае свой уклад жыцця, які можа адрозніваецца і этнакультурнай спецыфікай;

• назіранняў, якія дапамагаюць падчас экскурсій, забаў, прагляду тэлеперадач набываць вопыт і веды пра сваю культуру, а таксама пра культуры іншых народаў і міжнацыянальныя зносіны;

• адукацыйнай работы, перш за ўсё вынікoвых гутарак, мэта якіх – абагульненне, удакладненне і сістэматызацыя ведаў.



*Народныя святы* як адлюстраванне народнай традыцыі акумулююць народныя звычаі і абрады і тым самым выхоўваюць дзіця шляхам прыняцця ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры. Непасрэдны ўдзел у свяце дае вялізны эмацыянальны зарад, што, у сваю чаргу, абвастрае назіральнасць, успрыманне, абагачае пачуццёвы вопыт дзіцяці. На нашу думку, усё вышэйсказанае з'ўляецца ўмовай фарміравання цікавасці дашкольнікаў да этнакультурных з'яў. «Свята – гэта найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры, які адпавядае стану чалавека ў тым ці іншым сезоне, у тым ці іншым узросце. Прыемна, што зараз вяртаецца спрадвечная традыцыя ўдзелу дзяцей у народных святах побач з дарослымі. Гэта вельмі пазітыўны момант, таму што менавіта так стагоддзямі перадаваліся з пакалення ў пакаленне святочныя традыцыі. Дзеці з радасцю ўдзельнічаюць у народных святах, дакранаюцца да фальклору, што з'ўляецца для іх крыніцай выключнай прыгажосці і маральнага здароўя» [2, с. 9].

Народныя святы маюць свае адметнасці:

• калектывізм, што дае людзям магчымасць задаволіць патрэбы ў калектыўных перажываннях, сумеснай дзейнасці, ацэнцы важных для іх падзей (збор ураджаю, сустрэча вясны, пачатак палявых работ і інш.);

• кансерватызм, устойлівасць да знешніх уздзеянняў, стэрэатыпнасць паводзін людзей, што забяспечвае пераемнасць культуры;

• адлюстраванне непарыўнай сувязі чалавека з жыццем прыроды і працай;

• узбагачэнне эмацыянальнага стану чалавека – найважнейшая адметнасць свята, асабліва важная для дзяцей дашкольнага ўзросту з іх няўстойлівай увагай і псіхалагічна абумоўленым імкненнем да атрымання радасных эмоцый;

• пазітыўнае эстэтычнае ўздзеянне на чалавека, дзякуючы маляўнічай форме правядзення свята;

• выяўленне народнай творчасці ва ўсіх яе жанрах: паэтычным, музычным, песенным, драматычным, дэкаратыўна-прыкладным.

Народныя святы як асноўныя формы трансляцыі і ўзнаўлення этнакультурнага вопыту аб'ядноўваюць міфавобразы, семіятычныя адзінкі, аксіялагічныя складаючыя этнакультуры праз такія сродкі этнакультурнага выхавання, як песня, гульня, казка, загадка, мастацкая дзейнасць, далучаюць усіх суб'ектаў культурнай камунікацыі да культуратворчасці. Дзякуючы сваім асаблівасцям святы даюць магчымасць здзяйсняць рознабаковае выхаванне дзяцей. Так, падчас народнага свята ствараюцца ўмовы для развіцця эстэтычных пачуццяў дзіцяці: яны з ахвотай смяюцца, перажываюць, праяўляюць свае пачуцці, з задавальненнем выконваюць прызначаныя ім ролі. Непасрэд-

ная падрыхтоўка да свята – выраб атрыбутаў, падарункаў, запрашэнняў на свята – садзейнічае развіццю практычных уменняў і навыкаў этнакультуратворчай дзейнасці выхаванцаў. У працэсе правядзення і падрыхтоўкі да свята значна пашыраецца слоўнікавы запас дзяцей, яны знаёмяцца з новымі тэрмінамі, прыказкамі, прымаўкамі, закліч-камі, прыгаворамі і тым самым авалодваюць роднай мовай як першаснай, а таксама другаснымі семіятычнымі сістэмамі.

Відавочна, што пашырэнне кола зносін паміж суб'ектамі этнапрасторы адбываецца ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення свята. Дзеці незалежна ад полу, як правіла, ахвотна ўступаюць у зносіны з равеснікамі і дарослымі, што з'яўляецца падмуркам для раскрыцця іх асобы. Яны вучацца спецыяльным рытуальным дзеянням, якія прысутнічаюць на кожным свяце, вучацца падпарадкоўваць свае паводзіны агульнай культуры зносін. Важна і тое, што народныя святы з'яўляюцца ўмовай развіцця патрыятычных і нацыянальных пачуццяў. Народныя святы і абрады як сродак выражэння нацыянальнага характару з'яўляюцца яскравай формай адпачынку дарослых (педагогаў і бацькоў) і дзяцей, аб'яднаных сумеснымі дзеяннямі аксіялагічнага зместу.

Адна з форм далучэння дзяцей да этнакультуры – *перадсвяточныя вячоркі* [4, с. 6–8]. Задача педагога заключаецца ў стварэнні ўмоў для пазнання і практычнага засваення культурных каштоўнасцей надыходзячага народнага свята; фарміравання навыкаў зносін паміж усімі ўдзельнікамі культурнай камунікацыі; развіцця асабістых традыцый у сумеснай творчай дзейнасці; эмацыянальнага камфорту ў сумеснай этнакультуратворчай дзейнасці. Асноўныя віды культуратворчай дзейнасці на перадсвяточных вячорках: развучванне песень, карагодаў, гульняў; выраб атрыбутаў, неабходных для свята; аздабленне памяшкання (беларуская хата, зала і інш.) прадметамі даўніны; выраб паштовак-запрашэнняў, падарункаў-сюрпрызаў блізкім (родным, сябрам).

У працэсе падрыхтоўкі да свята мэтазгодна арганізацыя некалькіх вячоркаў, пры гэтым кожны раз змяняючы іх змест. Абапіраючыся на даследаванні Л. В. Какуевай, лічым мэтазгодным планаваць вячоркі ў тры ўзаемазвязаныя часткі. Першая частка – пазнавальная гутарка з дзецьмі; другая – практычная дзейнасць дзяцей і дарослых; трэцяя – творчыя, гульнявыя, музычна-літаратурныя заняткі, дзе дзеці аб'ядноўваюцца ў падгрупы і выконваюць агульную працу або займаюцца індывідуальна [4].

З мэтай павышэння цікавасці дзяцей на вячоркі «запрашаюцца» розныя персанажы (у першую чаргу міфалагічныя), якія праз семіятычныя тэксты дапамагаюць ім зразумець сэнс надыходзячага свята.



Заняткі павінны ствараць ўмовы для рознаўзроставых зносін паміж дзецьмі, што забяспечыць пераемнасць у перадачы старэйшымі сваіх ведаў пра этнакультуру малодшым – у гэтым крыецца галоўнейшы прынцып народнай педагогікі.

Эфектыўнымі формамі інтэграцыі дзяцей у этнаасяроддзе з'яўляюцца *гульні*. Дзякуючы народным гульням дзіця ўваходзіць у сістэму ўзаемаадносін суб'ектаў у працы, падчас адпачынку, у сям'і, у калектыве; засвойвае сістэму нормаў і правілаў паводзін, пераймае сацыяльныя ролі, вучыцца падпарадкоўвацца іншым і браць пэўную адказнасць. Народная гульня садзейнічала вырашэнню задач працоўнага выхавання: фарміраванню ў дзіцяці дадатных адносін да працы, развіццю пазнавальнай цікавасці да ведаў, імкненню прымяняць веды на практыцы, выхаванню такіх маральных якасцей, як працавітасць, адказнасць, мэтанакіраванасць, дзелавітасць, сумленнасць. Гульня выступала ў якасці адной з форм сацыялізацыі дзяцей, адным з каналаў міжпакаленнай сувязі, дзякуючы якім адбывалася перадача новаму пакаленню ведаў, паняццяў і навыкаў гаспадарчай дзейнасці [6].

Сюжэтна-ролевыя гульні дапамагалі падрыхтаваць сябе да жыцця. Часта ў такіх гульнях прысутнічалі лялькі (этнічна стылізаваныя цацкі), з дапамогай якіх у лялечных забавах дзеці маглі праіграць амаль усе святочныя звычаі і абрады, бытавыя сітуацыі, якія складаліся ў традыцыйных беларускіх сем'ях, ствараць лялек, якія адлюстроўваюць разнастайныя роды заняткаў беларусаў і інш.

Значнай увагі падчас этнавыхавання заслугоўваюць народныя карагодныя гульні, якія ствараюць умовы [6, с. 109]:

• для ідэнтыфікацыі асобы ў дзейнасці – магчымасць праявіць сваю актыўнасць і здольнасць да спеваў, танцаў, сцэнічны дар (песні часта разыгрываліся);

• для камунікатыўнай ідэнтыфікацыі – зносіны дзяцей, якія на падсвядомым узроўні дзякуючы прыкладу і асабістай актыўнасці «прысвойвалі» ўзоры паводзін дарослых (этыкет – што можна і чаго нельга рабіць, як сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі, як звяртацца да людзей, сацыяльныя ролі);

• для каштоўнасных арыентацый асобы – назапашванне ведаў аб тым (навучанне, расказ, паказ), як жыве прырода, як працуе чалавек, якія ўзаемаадносіны звязваюць родных і г. д.;

• для сацыялізацыі дзіцяці ў бліжэйшай этнакультурнай прасторы – паступоваму ўваходу ў соцыум з веданнем патрабаванняў да асобы, з уменнямі і навыкамі зносін і інш.

Гульні-драматызацыі галоўным чынам уплываюць на развіццё сцэнічнай творчасці, на здольнасці абыгрываць казкі, фальклорныя творы, міфавобразныя персанажы з выкарыстаннем выразных сродкаў

(мімікі, жэстаў, рухаў, стану), а таксама гульнявых атрыбутаў. «Пазітыўны патэнцыял гульні абумоўлены наяўнасцю пэўных культурных мадэлей і стыляў жыццядзейнасці для гульнявых персанажаў, з дапамогай якіх дзіця выражае свае ўласныя пачуцці, эмоцыі, перажыванні» [1, с. 22]. Гульня для педагога павінна стаць не толькі сродкам арганізацыі дзейнасці дзяцей, але і спецыфічным сродкам дыягностыкі іх паводзін і дейнасці ў этнакультурным асяроддзі.

*Мэтавыя прагулкі і экскурсіі* як формы пазнавальнай дзейнасці павінны ствараць умовы для таго, каб дзіця, не перапаўняючыся мноствам інфармацыі, магло атрымаць яскравыя ўяўленні аб аб'екце. Падчас прагулкі па вёсцы, горадзе, паходу ў краязнаўчы музей, а таксама штодзённых зносін з дарослымі і аднагодкамі неабходна забяспечыць знаёмства дзяцей з сацыяльнымі, культурнымі і прыроднымі разнавіднасцямі бліжэйшага акружэння. Мэта дадзенага віду дзейнасці – актывізаваць веды, якія ўжо набылі дзеці, пабудзіць іх да ўстанаўлення сувязей паміж набытымі ведамі і новай этнакультурнай інфармацыяй, якую атрымалі з паўсядзённага жыцця; абагаціць этнакультурны вопыт, дапамагчы набыць аб'ектыўныя ўяўленні і веды аб этнічнай культуры па-за заняткамі [11], стварыць ўмовы для ідэнтыфікацыі асобы дзіцяці ў якасці носьбіта этнакультуры. На прагулках і экскурсіях мэтазгодна знаёміць дзяцей з этнічнымі семіятычнымі сістэмамі: аналізаваць народныя прыкметы, адгадваць загадкі, засяроджваць увагу на асаблівасцях ландшафту, клімату, прыродных з'яў, адпаведных дадзенаму рэгіёну.

*Экскурсію ў краязнаўчы музей* мы разглядаем як адзін з галоўных сродкаў развіцця эмацыянальнага ўспрымання семіятычна выражанага этнакультурнага прадметнага асяроддзя (прадметаў даўніны) і каштоўнасных адносін да яго. Дзіця пачынае разумець такія паняцці, як «мінулае» і «сучаснасць. Дарослы дапамагае ўбачыць у творах мастацтва, прамысловай дзейнасці прыгажосць і высокае майстэрства іх стваральнікаў, адчуць, як змяняюцца з часам прадметы побыту, адзенне. Параўноўваючы прадметы даўніны і сучасныя вырабы, дзеці знойдуць шмат агульнага і ўбачаць, што традыцыі майстэрства захоўваюцца.

Пры знаёмстве з архітэктурай старажытнага і сучаснага горада (вескі) лічым неабходным выкарыстанне параўнанняў для таго, каб дзіця бачыла агульнае і рознае ў іх будове. Параўноўваючы сучасныя і старажытныя пабудовы, культавыя збудаванні, дзеці вучацца іх успрымаць як каштоўнасці этнічнай культуры. Такія формы работы, на нашу думку, дапамогуць дзецям атрымаць новыя «жывыя» веды краязнаўчага характару. Акрамя таго, падчас экскурсій і прагулак выхаванцы будуць мець магчымасць атрымаць новыя веды і аб іншых этнічных агульнасцях, ладу іх жыцця, культуры.



*Сумесная культуратворчая дзейнасць суб'ектаў этнапрасторы* (дзеці, педагогі, бацькі) прадстаўляе сабой, з аднаго боку, плённыя зносіны «настаўніка» і «вучня», з другога – сумеснае пераўтварэнне сапраўднасці, больш таго, стварэнне новай педагагічнай рэальнасці, у выніку якой адбываецца творчае ўзаемаабагачэнне педагога і вучня. Чым ярчэй творчыя функцыі вучня, тым прадуктыўней працэс сумеснай дзейнасці [7, с. 11–12].

Зыходзячы з культуралагічнага падыходу да працэсу выхавання, Н. Е. Шчуркова [14] вызначыла асноўныя рысы сумеснай дзейнасці педагога і дзяцей. На наш погляд, яны ўласцівы і сумеснай творчасці падчас этнакультурнай дзейнасці. Такімі асаблівасцямі з'яўляюцца:

• экзістэнцыяльная актуалізацыя ў разуменні выхавальніка і выхаванца цякучай сумеснай работы як моманту асабістай жыццятворчасці, тварэння сучаснасці як папярэдніка будучага;

• усведамленне дыялагічнага ўзаемадзеяння ў асаблівым – каштоўнасным – вымярэнні, калі і выхавальнік, і выхаванец рэфлексуюць працэс і вынік сумеснай творчасці як каштоўнасна ўтрымліваемыя. Актывізацыя такой рэфлексіі адбываецца ў дыялогу;

• стварэнне ўмоў для свабоднага выбару кожным удзельнікам сумеснай дзейнасці (выбар віда дзейнасці, права на выражэнне асабістых адносін да працэсу і яго выніку, ініцыятыва выкарыстання новых падыходаў і спосабаў вырашэння праблемы і задач, фіксацыя крокаў свайго самаразвіцця);

• адэкватны выбар формаў работы, якія адпавядаюць характару канструіруемай выхавальнікам крэатыўнай сітуацыі, а таксама ўзроставым і індывідуальным асаблівасцям выхаванцаў. Пры гэтым праз прызму формы дзіця ацэньвае тое, што адбываецца і далучаецца да творчага працэсу.

Падчас інтэграцыі выхаванцаў у этнаасяроддзе важна арганізаваць сумесныя этнакультуратворчыя заняткі для дзяцей і дарослых, забяспечыць іх прадуктыўнае ўзаемадзеянне, будзе спрыяць агульнаму творчаму росту ўдзельнікаў. Асноўнымі этапамі арганізацыі такіх заняткаў этнакультурнага зместу могуць стаць:

1) эмацыянальнае ўспрыманне матэрыялу (пазнавальныя заняткі, экскурсіі, гутаркі, разглядванне ілюстрацый матэрыялаў і г. д.);

2) асэнсаванне ўспрынятага матэрыялу (збор інфармацыі, калекцыяніраванне, класіфікацыя, апісанне і інш.);

3) узнаўленне ў розных відах дзейнасці (выяўленчая дзейнасць, выраб макетаў, народныя гульні);

4) творчае прымяненне і выкарыстанне засвоенага матэрыялу (гульні-драматызацыі, прэзентацыя праектыў і г. д.) [3, с. 35–37].

Пры пабудове сістэмнай мадэлі сумеснай творчасці на агульнай культуралагічнай аснове лічым важным вылучыць складаючыя сумеснай творчай дзейнасці:

1) суб'ектны блок – вызначэнне ўдзельнікаў узаемадзеяння і іх ролей (функцый) у мадэлюемым культурным асяроддзі;

2) праксеалагічны блок – вызначэнне відаў дзейнасці, найбольш характэрных для этнакультурнай сітуацыі выхавання і навучання;

3) аксеалагічны блок – вызначэнне сістэмы каштоўнасных адносін, ідэалаў, норм, ацэнак і каштоўнасных арыентацый суб'ектаў, якія ўтвараюць каштоўнасны змест канструіруемага этнакультурнага асяроддзя;

4) семіётыка-камунікатыўны блок – этнічна выражаныя натуральныя і другасныя знакавыя сістэмы, якія ўключаюць і прадметнае напаўненне лакальнай культурнай прасторы; вызначэнне мадэлей сумеснай творчай камунікацыі, навыкаў паспяховай камунікацыі і правіл камунікацыйных паводзін;

5) дыдактычны блок крэатыўнага характару – вызначэнне мэтавых прыярытэтаў у выхаванні і навучанні на аснове этнічнага матэрыялу, задачапабудова, адбор (сумесная распрацоўка) вобласці сродкаў і іх прымяненне ў сумесным творчым дыялогу.

Педагог стварае ўмовы для сумеснай творчасці, асаблівую ўвагу надае формам сумеснай дзейнасці і падтрымцы добразычлівай эмацыянальнай атмасферы. Дадзеныя блокі дазваляюць зрабіць такую сістэму максімальна эфектыўнай і найбольш поўна далучыць выхаванцаў да творчага працэсу.

Энтакультурная прастора інтэграцыі дашкольнікаў павінна насіць прыкметы натуральнага асяроддзя жыццядзейнасці. Лічым, што найбольш прыдатным асяроддзем сумеснай творчасці паміж педагогам, выхаванцамі і іншымі суб'ектамі можа стаць спецыяльна арганізаваная прастора дашкольнай установы («міні-музей» або «астравок» этнакультуры). Як адзначае доктар філасофскіх навук, прафесар В. У. Пазнякоў, культурная прастора музея здольная перанесці свой творчы патэнцыял на наведвальнікаў, дапамагчы асобе раскрыць у сабе нейкія дрымотныя творчыя сілы. Аўтар характарызуе музей як:

• культурную прастору, здольную раскрыць творчыя патэнцыялы і сфарміраваць творчую асобу;

• культурную прастору, якая ў найбольшай ступені спрыяе творчаму развіццю індывідуальнасці;

• культурную прастору, якая валодае выбіральнасцю ў сэнсе сваёй накіраванасці ўздзеяння на асобу; яна фарміруе такі тып асобы, які арыентаваны на пэўны тып дзейнасці, на творчыя зносіны з культурнымі каштоўнасцямі [10, с. 16].



Неабходна звярнуць увагу на такую акалічнасць, як дыялагізм музея. Музей як прастора адносін (наведвальнікі, прадметы культуры, інтэр'ер, ідэі, сэнсы і г. д.), як прастора наяўных узораў культуратворчай дзейнасці павінен стаць суразмоўцам, партнёрам дыялагічных зносін з наведвальнікамі. Музей прапануе тэму, сюжэт, ідэю, сэнс, якія могуць па-рознаму ўплываць на наведвальнікаў [10]. Задача педагога, на наш погляд, заключаецца ў стварэнні такога этнакультурнага асяроддзя, якое ў поўнай меры змагло б "паглынуць" дзіця, натхніць захапіцца непаўторнасцю, арыгінальнасцю прадстаўленых узораў культуры беларусаў, абудзіць жаданне прыняць актыўны ўдзел у сумеснай культуратворчай дзейнасці – забяспечыць творчае ўваходжанне індывіда ў этнакультуру.

Асновай канструявання прасторы «міні-музея» этнакультуры ў дашкольнай установе павінны стаць адносіны. Катэгорыя «адносіны» ўказвае на існуючую сувязь, г. зн. зададзеную або задаваемую паміж суб'ектамі, прадметамі і сэнсавымі ўтварэннямі, якія насяляюць дадзеную прастору [9]. У нашым выпадку можна разглядаць:

• адносіны паміж суб'ектамі, якія «насяляюць» культурную прастору «міні-музея» (дзіця – дзіця, дзіця – педагог, дзіця – група аднагодкаў і г. д.);

• адносіны паміж прадметнымі формамі культуры як знакава-сімвальнымі і семантычнымі рэальнасцямі (адносіны паміж рэчамі павінны мець сэнсавае адзінства, аб'яднанасць агульнай ідэяй);

• адносіны паміж выхаванцамі і культурнымі народнымі традыцыямі, прадстаўленымі ў асяроддзі «міні-музея»;

• адносіны паміж мікрапрасторамі, мікрапрасторай «міні-музея» этнакультуры і культурнай прасторай дзіцячага сада;

• адносіны паміж дашкольнікамі і відамі культуратворчай дзейнасці ў пэўнай прасторы «міні-музея».

Прастора «міні-музея» этнакультуры ў дашкольнай установе абавязкова павінна мець канкрэтную ідэю (семантычнае ядро), якая будзе пранізваць усе вышэй пазначаныя адносіны, прадметныя формы культуры і дзейнасць прадстаўленых у ёй суб'ектаў [9, с. 4–8].

Мэтанакіраванае выкарыстанне вышэйпазначанай этнакультурнай прасторы, на нашу думу, дапаможа забяспечыць дзіцяці адэкватнае ўспрыманне сваёй нацыянальнасці і сфарміраваць у яго пазітыўныя адносіны да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, развіваць міжкультурную кампетэнтнасць, а таксама талерантнасць. Арганізацыя такога асяроддзя патрабуе ад педагогаў глыбокіх краязнаўчых ведаў, набыць якія выхавальнікі змогуць падчас супрацоўніцтва з гарадскімі (сельскімі) краязнаўчымі музеямі, творчымі калектывамі, бібліятэкамі і інш. Акрамя таго, удзел у мадэляванні этнакультурнага

асяроддзя зблiжае ўсiх суб'ектаў этнавыхаваўчага працэсу ў адзiнай – сумеснай культуратворчай – справе: арганiзацыi «хатняга музея», збору прадметаў побыту, пашыву нацыянальнага адзення, удзелу ў гутарках, экскурсiях, занятках, народных святах, выставах народнай творчасцi.

Музейна-адукацыйная сiстэма работы з дзецьмi:

• арыентуецца на сiстэмнасць i цэласнасць работы ў дадзеным накiрунку;

• арыентуецца на iнтэграцыю розных вiдаў дзiцячай дзейнасцi i музейнага дыялогу;

• арыентуецца на ўлiк узроставых i iндывiдуальных асаблiвасцей дзяцей;

• арыентуецца на апору на нагляднасць, эмацыянальна-пачуццёвае ўспрыманне прадметнага свету ў развiваючым асяроддзi «мiнi-музея» i iнш.

З нашага пункту гледжання, працэс сумеснай творчасцi пачынаецца на этапе стварэння экспазiцыi «мiнi-музея». У дадзеным культуратворчым працэсе ўдзельнiчаюць усе суб'екты, якiя насяляюць этнапрастору. Дзецi павiнны прымаць удзел у абмеркаваннi тэматыкi экспазiцыi, папаўняць выставы экспанатамi, сумесна з бацькамi займаючыся пошукавай дзейнасцю, выступаць ў ролi экскурсаводаў. Музейныя экспанаты (этнакультурна i семiятычна выражаныя прадметы) павiнны стаць даступнымi для дзяцей. У сапраўдным музеi дзiця – пасiўны сузiральнiк, а тут – сааўтар, творца экспазiцый, пры гэтым не толькi само дзiця, але i яго родныя. Кожны «мiнi-музей» павiнен стаць вынiкам зносiн, сумеснай культуратворчай працы педагогаў, дзяцей i iх сем'яў.

На этапе наведвання экспазiцыйнай выставы дзецi знаёмяцца з рознымi вiдамi дэкаратыўнага мастацтва (вырабы з дрэва, глiны, саломы, паперы, вышыўка, пляценне), з iх пабытавым i эстэтычным назначэннем. Пасля наведвання мiнi-музея педагогi ствараюць умовы для наладжвання сумеснай культуратворчай дзейнасцi. Ад эмацыянальнага ўспрымання выхаванцы пераходзяць да перамання (iмiтавання), дзе неабходную дапамогу ў культуратворчай дзейнасцi iм аказваюць дарослыя. Важна пазначыць, што заняткi дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, акрамя развiваючага, маюць яшчэ i выхаваўчае значэнне, дапамагаюць сфармiраваць эстэтычныя, маральныя, экалагiчныя ўстаноўкi, спрыяюць патрыятычнаму выхаванню асобы. Такiм чынам, ствараючы асабiстыя маленькiя творы, дзецi выражаюць свае адносiны да культурнай спадчыны, не проста ўзнаўляюць, але i ў даступных формах i даступнымi сродкамi ствараюць жывую культуру, канешне, не прэтэндуючы на грамадскую значнасць атрымана прадукту [4]. На апошнiм этапе адбываецца сумеснае прадстаўленне гатовага прадукту культуратворчай дзейнасцi. Адной з важнейшых акалiчнасцей выступае тое, што адказнасць за якасць дадзенага прадукту павiнен узяць на сябе кожны з удзельнiкаў культуратворчага працэсу.



Эфектыўнай формай узаемадзеяння ўстановы адукацыi i сям'i з'яўляецца *гуманiзацыя адукацыi бацькоў*. Яна прадугледжвае азнаямленне бацькоў з сучаснымi падыходамi i метадамi выхавання, асобасны рост бацькоў, павышэнне адказнасцi, развiццё iх творчай актыўнасцi, уключэнне бацькоў у дзейнасць дашкольнай установы як актыўных саўдзельнiкаў педагагiчнага працэсу, носьбiтаў народнай культуры, правядзенне сумесных заняткаў i даследчых гульняў, удзел у педагагiчных чытаннях. Сумесную творчасць педагога, дзяцей i iх бацькоў можна ацанiць, зыходзячы з трох узроўняў узаемадзеяння:

1. Фармiраванне перадумоў для сумеснай творчай дзейнасцi (эмацыянальных, кагнiтыўных, матэрыяльных i iнш.).

2. Асабiстая творчая дзейнасць (вызначэнне мэт i задач, ролей; дыферэнцыяцыя па вiдах, чакаемыя вынiкi i iнш.).

3. Узрастаючы аб'ём прадуктыўнай дзейнасцi (iнiцыятыва, свабода iмправiзацыi, асацыятыўныя вырашэннi, стварэнне аўтэнтычнага прадукту, складанне арыгiнальных аўтарскiх задач, высокi эмацыянальны пад'ём).

Такiм чынам, сумесная творчая дзейнасць з'яўляецца эфектыўным сродкам далучэння дзяцей да этнакультуры. Неабходнымi ўмовамi ў наладжваннi культуратворчай сумеснай дзейнасцi з'яўляецца актыўнае выкарыстанне традыцый народнай культуры, творчая пераемнасць яе найлепшых узораў. Этнакультурнае асяроддзе павiнна стаць умовай рэалiзацыi творчых iдэй i задумак удзельнiкаў выхаваўчага працэсу, забяспечыць улiк узроставых i псiхалагiчных магчымасцей дзяцей, спрыяць сяброўскiм зносiнам дзяцей адзiно з адным, памiж педагогамi i бацькамi.

У якасцi *метадаў* мы разглядаем спецыфiчныя спосабы i прыёмы выхаваўчай работы, якiя выкарыстоўваюцца ў працэсе фармiравання асобасных якасцей для развiцця патрэбасна-матывацыйнай сферы i свядомасцi выхаванцаў, для выпрацоўкi навыкаў i прывычак паводзiн, а таксама для iх карэкцыi i ўдасканалення [13, с. 320].

Так, *гульнёвыя метады* выклiкаюць у дзяцей павышаную цiкавасць, дадатныя эмоцыi, садзейнiчаюць канцэнтрацыi ўвагi падчас правядзення заняткаў i гутарак. Як адзначае Т. В. Паштарова, любыя гульнi лёгка насычаюцца этнакультурным зместам i дыдактычнага, i забаўляльнага характару [11]. Гульнёвы вопыт дзяцей, уключае, як правiла, элементы народных гульняў, фальклорныя забаўлянкi,

лічылкі. Выкарыстоўваючы разнастайныя гульнёвыя сітуацыі, педагог арганічна і мэтанакіравана зможа ўвесці дзяцей у свет народнай культуры, этыкі, чалавечых адносін.

На нашу думку, у рабоце з дзецьмі мэтазгодна выкарыстоўваць гульні, накіраваныя на дэферэнцыяцыю прадметаў побыту, адзення, якія выкарыстоўваліся ў мінулым і сёння. Такія гульні дапамогуць выявіць узровень інфармаванасці дзяцей аб этнічнай культуры, створаць умовы для іх ідэнтыфікацыі ў якасці носьбітаў этнакультуры. Лічым неабходным арганізацыю розных гульняў: гульні-падарожжы, гульні-драматызацыі, гульні-тэатралізацыі, гульні-рэканструкцыі; правядзенне інтэлектуальных гульняў, гульняў-тэлеперадач. Своеасаблівы сінтэз гульні і адукацыі зможа павысіць эмацыянальны фон заняткаў, пазнавальную актыўнасць дзяцей, аблегчыць працэс асэнсавання, запамінання і засваення таго этналагічнага матэрыялу, з якім іх знаёміць педагог.

Разам з гульнёвымі метадамі мэтазгодна выкарыстоўваць шэраг *метадаў, якія накіраваны на стымуляванне пазнавальнай, даследчай і сацыяльнай актыўнасці* асобы:

• канцэнтрычны метад падачы этналагічнага матэрыялу з выкарыстаннем дыдактычнага прынцыпу ад простага да складанага (сям'я – двор – вуліца – дзіцячы сад – горад (вёска) – раён – вобласць – краіна);

• метад «ажыўлення» тэарэтычнага матэрыялу – казак, былін, паданняў і іншага пры дапамозе тэатралізацыі;

• эўрыстычны (даследавання) метад;

• метад мадэлявання, канструявання, рэканструявання.

Такія метады, як правіла, спалучаюць слоўнае тлумачэнне, практычную рэалізацыю і гульнёвую матывацыю. Метады *мадэлявання* і *канструявання* могуць выкарыстоўвацца пры рабоце з картай, глобусам, схемай, пры канструяванні архітэктурных пабудоў розных народаў, макетаў сельскіх і гарадскіх асяроддзяў і інш.

Эфектыўным, на наш погляд, з'яўляецца выкарыстанне *наглядных* і *слоўных метадаў* (паказ дыдактычных дапаможнікаў, вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, чытанне народных казак, легендаў, паданняў і інш.). Родная мова непасрэдна звязвае дзіця са сваім народам. Задача педагога заключаецца ў тым, каб пасродкам гаварэння і слухання прывіць дзіцяці пачуццё любові да роднай мовы, развіць чуццё да яе гукавай прыгажосці. Родная мова павінна стаць «мовай прыемнасці» [12]. Неабходна стварыць умовы для таго, каб у дзіцяці з'явілася жаданне практыкаваць родную мову пры зносінах, падчас гульні і іншых актыўных формаў узаемадзеяння [5].

Вялікае значэнне для павышэння актыўнасці і эмацыянальнасці дзяцей у працэсе далучэння іх да этнакультуры мы надаём такім *гульнёвым метадам*, як сюрпрызныя моманты (буслік прынёс пісьмо),



выкананне разнастайных гульнёвых дзеянняў (народная рухомая гульня), разыгрыванне роляў і інш. Значная ўвага павінна надавацца такому метаду, як *параўнанне*. Ён дапамагае выяўляць агульнае і асобаснае ў гістарычным развіцці і культурах розных народаў. Дзеці могуць групіраваць і класіфікаваць розныя семіятычныя адзінкі (прадметы, малюнкі, сімвалы, казачных персанажаў, стравы і г. д.), якія адносяцца да этнічнай культуры беларусаў і з'яўляюцца «прадстаўнікамі» культуры іншых этнічных агульнасцей.

Мэтазгодна падчас далучэння дзяцей да этнічнай культуры выкарыстоўваць *метады пытанняў*. Так, педагог ставіць пытанне, тым самым прымушаючы дзяцей на аснове ўласных назіранняў, асабістага вопыту, уяўленняў параўноўваць, супастаўляць асобныя факты, з'явы, адпаведныя этнічным культурам, а затым рабіць вынікі, вылучаючы пры гэтым нешта агульнае, адзінае, асаблівае ў этнакультурах.

Значным метадам этнакультурнага выхавання выступае *метад праектаў*. Ён акумулюе арганізацыю сумеснай творчай дзейнасці дзяцей, педагогаў і бацькоў і накіраваны на збор, вывучэнне, аналіз, а затым прэзентацыю матэрыялаў, якія раскрываюць асаблівасці традыцый, ладу жыцця, прадметаў побыту, мастацтва розных народаў. У аснове праектнай дзейнасці ляжыць актывізацыя яе пазнавльнай і практычнай складаючых, у выніку чаго выпрацоўваецца прадукт, які валодае суб'ектыўнай або аб'ектыўнай навізной. Тэмы праектаў прапануе педагог або яны выбіраюцца самастойна бацькамі і дзецьмі.

Такім чынам, эфектыўнымі формамі далучэння дашкольнікаў да этнічнай культуры беларусаў з'яўляюцца:

• заняткі (спецкурсы, факультатывы) комплексна-інтэграванага характару на аснове адзінага этналагічнага зместу;

• гутаркі на этналагічныя тэмы;

• народныя святы і забавы;

• перадсвяточныя вячоркі;

• экскурсіі ў краязнаўчы музей і паходы на прыроду;

• сумесная культуратворчая дзейнасць суб'ектаў этнапрасторы;

• гуманізацыя адукацыі бацькоў.

Сярод найбольш эфектыўных метадаў назавём: гульнёвыя, наглядныя, слоўныя, метады пытанняў, мадэляванне, канструяванне, метад праектаў.

Вышэйзгаданыя акалічнасці дазволілі зрабіць наступныя вынікі:

1. Усе адзначаныя формы і метады абумоўлены асноўнымі падсістэмамі этнакультуры беларусаў.

2. Усе названыя вышэй формы і метады садзейнічаюць павышэнню этнакультурнай дасведчанасці, фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці, станаўленню каштоўнасных арыенціраў дашкольнікаў.

3. Наяўнасць дадзеных формаў і метадаў – адна з умоў інтэлектуальна-творчага развіцця дашкольнікаў, аснова іх далучэння да этнічнай культуры беларусаў.

4. У адрозненне ад існуючых даследаванняў па праблеме этнакультурнага выхавання, мы прапануем комплекснае выкарыстанне вышэйзгаданых формаў і метадаў далучэння дзяцей да этнічнай культуры беларусаў, якія забяспечаць павышэнне этнічнай дасведчанасці, фарміравання этнічнай ідэнтычнасці і станаўлення каштоўнасных арыенціраў апошніх для актыўнага ўзаемадзеяння з дзецьмі і дарослымі, а таксама бліжэйшым сацыякультурным акружэннем.

**Спіс літаратуры**

1. *Дубініна, Д. М.* Культура Беларусі ў казках і паданнях: этнакультурная адукацыя дашкольнікаў: дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна, Д. У. Дубінін. – Мінск, 2008. – 120 с.

2. *Жалняровіч, Н. І.* Хутка ў нашай хаце свята: знаёмім дашкольнікаў з традыцыямі беларусаў: дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Н. І. Жалняровіч, М. А. Каліноўская. – Мазыр, 2009. – 63 с.

3. *Захарова, Л. М.* Этнопедагогические технологии в дошкольном образовании / Л. М. Захарова // Начальная школа: плюс до и после. – 2009. – № 2. – С. 35–37.

4. *Кокуева, Л. В.* Духовно-нравственное воспитание дошкольников на культурных традициях своего народа: метод. пособие / Л. В. Кокуева. – М., 2005. – 144 с.

5. *Куксава, Н.* Воспитание личности: нравственно-патриотические основы / Н. Куксова // Пралеска. – 2005. – № 5. – С. 11–15.

6. *Латышына, Д. И.* Традиции воспитания детей у русского народа / Д. И. Латышина. – М., 2004. – 128 с.

7. *Никитина, Е. И.* Сотворчество педагога и учащихся на занятиях художественным движением в системе дополнительного образования: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.08 [Электронный ресурс] / Е. И. Никитина. – 2007. – Режим доступа: http://www.art-education.ru/avtoreferaty/avtoreferat-nikitina.doc. – Дата доступа: 30.03.2009. – С. 11–12.

8. Педагогика: учеб. пособие для студентов педагогических вузов и пед. колледжей / под ред. П. И. Пидкасистого. – М., 1996. – 602 с.

9. *Позняков, В. В.* Конструирование воспитательного пространства / В. В. Позняков // Праблемы выхавання. – 2006. – №5. – С. 4–8.

10. *Позняков, В. В.* Культурное пространство музея / В. В. Позняков // Музей как креативное пространство культуры: междунар. науч.-практ. конф., Минск, 11–14 окт. 2004 г.: сб. науч. ст. / под науч. ред. В. И. Прокопцова [и др.]. – Минск, 2005. – С. 9–20.



11. *Поштарева, Т. В.* Формы и методы формирования этнокультурной осведомленности детей / Т. В. Поштарева // Дошкольное воспитание. – 2007. – № 12. – С. 28–36.

12. *Старжынская, Н. С.* Методыка развіцця роднай мовы: вучэб. дапам. / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск, 2008. – 301 с.

13. *Харламов, И. Ф.* Педагогика: учеб. пособие / И. Ф. Харламов. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Высш. шк. – 1990. – 576 с.

14. *Щуркова, Н. Е.* Новое воспитание / Н. Е. Щуркова. – М., 2000. – 128 с.

*И. И. Калачева*

## АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СЕМЬИ И БРАКА В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ

Проблемам семьи и брака в современной Беларуси уделяется повышенное внимание, в особенности подготовке молодежи к семейной жизни, поддержке молодой семьи, в том числе и студенческой. Учёными признается тот факт, что молодая семья является существенным ресурсом в репродуктивном потенциале общества. Она способна быть транслятором нравственных ценностей предыдущих поколений, связующим звеном между прошлым, настоящим и будущим.

В республике действует ряд государственных программ: «Дети Беларуси», «Молодежь Беларуси», «Молодые таланты Беларуси», Национальная программа демографической безопасности (2007–2010 гг.). Практически во всех программах представлены стратегические направления социальной поддержки семьи, подготовки молодежи к семейной жизни. Важнейшей приметой государственного подхода к семье и браку является объявление 2006 г. – Годом матери, 2007 – Годом ребенка, 2008 – Годом здоровья.

Ценность семьи, семейная жизнь в сознании большинства белорусов по-прежнему остаются фундаментальной основой их образа жизни. Исходя из данных социологических опросов населения Республики Беларусь, проведенных в 2000, 2007 и 2008 гг., важное значение семьи в своей жизни отмечают почти 80 % опрошенных (Центр социальных и политических исследований БГУ). При этом семья как социальная ценность важна как для женщин, так и для мужчин (86,0 % и 74,8 % соответственно). На семью ориентированы 79 % молодых людей в возрасте 18–29 лет и большинство населения в возрастной группе 30–49 лет (85 %).

В 90-е гг. XX в. отмечались признаки *трансформации семьи и брака:* уменьшение численности заключенных браков, их «старение», увеличение числа нерегистрируемых браков. Белорусскими демографами, социологами отмечались падение рождаемости и